**УДК 397**

# ЯЎРЭІ ЎСХОДНЯЙ ВІЦЕБШЧЫНЫ Ў 1920-1930-Х ГГ.: СТАТЫСТЫЧНА-ДЭМАГРАФІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА

***В. М. ЗАЙЦАВА***
***(Прадстаўлена: канд. гіст. навук, дац. У. Я. АЎСЕЙЧЫК)***

*У артыкуле прадстаўлена статыстычна-дэмаграфічная характарыстыка яўрэйскай этнічнай супольнасці на тэрыторыі ўсходняй Віцебшчыны ў 1920-1930-х гадах. Асноўнымі крыніцамі даследавання сталі перапісы насельніцтва СССР 1926 і 1939 гадоў, з улікам іх асаблівасцей.*

У сучасны перыяд на тэрыторыі Беларусі побач з беларусамі (тытульным этнасам) пражываюць прадстаўнікі іншых этнічных супольнасцей з адметнай культурай і гісторыяй. А таму немагчыма ўявіць даследванні па этнічнай гісторы беларускіх земляў без вывучэння і тых этнічных груп, якія іх насяляюць. У прадстаўленым артыкуле, будзе разгледжана яўрэйская этнічная супольнасць усходняй Віцебшчыны ў 1920-1930-х гг. Для даследавання пазначанай прабліематыкі быў выкарыстаны комплекс статыстычных матэрыялаў, асабліва даныя перапісаў 1926 і 1939 гг. Геаграфічныя рамкі даследавання будуць ахопліваць усходнія землі сучаснай Віцебскай вобласці. У даследуемы храналагічны адрэзак гэтыя тэрыторыі ўваходзілі ў розныя адміністрацыйныя адзінкі. У пачатку 1920-х гг. тэрыторыя рэгіёна ўключала ўсходнія беларускія паветы Віцебскай губерні (да 1924 г.). А з 1924 г. гэтыя землі ўваходзілі ў склад Віцебскай і Полацкай акруг.

У пачатку XX ст. адбыліся адчувальныя змены ў размяшчэнні яўрэяў. На фоне паступовага павелічэння іх колькасці ў Віленскай, Віцебскай і Гродзенскай губернях, асабліва заўважна змяншэнне ў Мінскай. Адбывалася не толькі "унутранае" пераразмеркаванне, узрастаючая напружанасць у межах аселасці выштурхвала пэўную частку яўрэяў за межы Расійскай імперыі. З 1897 года па 1917 год з Беларусі ў ЗША іх выехала 317 тысяч чалавек (з Віцебскай - 47 тысяч). Але, трэба мець на ўвазе, што да 1920-х г. не было дакладных падлікаў аб колькасці яўрэскага насельніцтва ў пазначаным рэгіёне [11].

Статыстычныя дадзеныя аб колькасці яўрэйскага насельніцтва на тэрыторыі рэгіёна ў 1920-я гг. утрымліваюцца ў усесаюзным перапісе насельніцтва СССР 1926 года, папярэднія вынікі якога былі часткова апублікаваны ў 1927 г. Пры аналізе матэрыялаў перапісу, трэба звярнуць увагу на тое, што пад час збору дадзеных насельніцтву задаваліся два пытанні: да якой народнасці яны сябе адносяць і на якой мове размаўляюць. Як вынікае з перапісу, яўрэйскае насельніцтва ў цэлым па БССР складала 407 059 чалавек, або 8,2%. У Полацкай і Віцебскай акругах паводле вызначэння народнасці яўрэйская супольнасць налічвала 70 762 чал., або 7,79% ад агульнай колькасці насельніцтва. Што датычыцца роднай мовы, то тут лічба памяншаецца да 63 087 чал. Па дэмаграфічных паказчыках колькасць яўрэяў мужчынскага полу складала 33 290 чал. Жаночая частка ў сваю чаргу налічвала 37 472 чал. З іх агульнай колькасці на гарадскую частку насельніцтва яўрэйскага паходжання прыходзілася 63 274 чал., у тым ліку 29 534 мужчын і 33 740 жанчын. Яўрэйскае насельніцтва з сельскай мясцовасці налічвала 7 488 чал. (мал.1), з якіх 3 756 муж. і 3 732 жанчын [3]. На падставе гэтага добра бачна, што большасць яўрэяў сканцэнтравана па гарадах. Паводле такога дэмаграфічнага паказчыка, як "узровень адукацыі", перапіс змяшчае ў сабе звесткі адносна ўсёй тэрыторыі БССР. На падставе гэтых звестак колькасць яўрэяў, якія маюць адукацыю складала 280,5 чал. (68,9%), з якіх 142,1 жанчыны і 138,4 мужчыны [2]. Улічваючы такую адукаваннасць яўрэяў, трэба звярнуць увагу на ўстановы, у якіх яны маглі яе атрымаць. Яны былі прадстаўлены казённымі вучылішчамі 2-х разрадаў, талмуд-торамі, хедэрамі, іешывамі, а таксама меламедамі [1]. Так, сярод яўрэяў адной з галоўных цнотаў заўсёды лічылася вывучэнне Торы, таму ўсе імкнуліся даць сваім сынам адукацыю. Дзеці больш-менш заможных габрэяў наведвалі хедэры, а бедныякі маглі хадзіць у бясплатныя супольныя рэлігійныя школы, якія атрымалі назву талмуд-тор [7]. Пыкладам развіцця яўрэйскіх школ з'яўляецца іх наяўнасць у многіх мястэчках. Напрыклад ёсць звесткі пра існаванне школы ў Лепелі. Аднак пасля пажару, які здарыўся 21 жніўня 1921 г., у г. Лепелі з пяці засталося толькі дзве школы (не аднавіла сваёй дзейнасці і яўрэйская школа) [8, с. 22].

Акрамя школ на працягу 1920-х гг. адчыняліся і іншыя установы, якія спрыялі атрыманню адукацыі сярод яўрэйскага насельніцтва. Напрыклад, у другой палове 1920 - х гг. у мястэчку Бешанковічы з'явіліся такія нацыянальныя ўстановы, як пункт па ліквідацыі непісьменнасці яўрэйскага насельніцтва для 80 чалавек (створаны ў 1926 г.) і яўрэйская дзіцячая пляцоўка (была адкрыта 15 чэрвеня 1927 г.) [7]. Аднак ужо ў 1937 г. рэзка змянілася стаўленне Кампартыі Беларусі да мовы яўрэяў – ідыш. Пачалося закрыццё яўрэйскіх школ. У 1938 г. яны амаль цалкам спынілі існаванне ў Мінску, а затым і па ўсёй рэспубліцы [6, с.98].




**Малюнак 1. – Склад яўрэйскага насельніцтва усходняй Віцебшчыны паводле Усесаюзнага перапісу СССР 1926 г.**

Для больш выразнага ўяўлення дынамікі колькасці яўрэйскага насельніцтва пражываючага на тэрыторыі пазначанага рэгіёна трэба параўнаць дадзеныя перапісу 1926 года як з матэрыяламі больш ранняга перыяду, так і пазнейшага. За аснову гэтых матэрыялаў былі ўзятыя Памятныя кніжкі Віцебскай губерні, першы усеагульны перапіс Расійскай імперыі 1897 года, а таксама ўсесаюзны перапіс насельніцтва СССР 1939 года. Варта адзначыць, што перапіс 1939 года сярод большасці даследчыкаў выклікае пытанні аб яго дакладнасці. А крыху ранейшы перапіс 1937 года ўвогуле быў прызнаны савецкай уладай дефектным, аб чым сведчыць пастанова СНК СССР ад 26 верасня 1937 года [10]. Так, з аналізу прадстаўленных звестак вынікае, што колькасць асоб яўрэйскага паходжання, якія пражываюць на тэрыторыі Віцебшчыны за 1862 год (усходнія беларускія паветы Віцебскай губерні) складала 37 746 чал., за 1884 г. (усходнія беларускія паветы Віцебскай губерні) - 76 661 чал.; 1897 ( усходнія беларускія паветы Віцебскай губерні) - 90 102 чал.; 1902 (усходнія беларускія паветы Віцебскай губерні) - 89 944 чал. [5]; 1926 (Віцебская і Полацкая акругі) – 70 762 чал. [3]; 1939 (Віцебская вобласць) - 77 173 чал. [4]. Адносна перапісу 1939 года, можна дадаць звесткі аб тым, што агульная колькасць яўрэйскага насельніцтва ў БССР у гэты час налічвала 375 092 чал. (6,7%).

Характарыстыку дынаміцы колькасці яўрэяў дае ў сваім артыкуле Е. Розенблат, аднак прыводзячы яе па тэрыторыі ўсёй рэспублікі. Так, у сваёй працы ён заключае, што за перыяд з 1926 па 1939 год дынаміка колькасці яўрэйскага насельніцтва БССР выглядае наступным чынам: у 1927 годзе тут пражывала 407,1 тысячы яўрэяў, у 1931 годзе - 440,2 тысячы, у 1937 годзе - 363,2 тысячы, у 1939 годзе - 375,1 тысячы. На падставе гэтых дадзенных ён робіць вынік, што ў 1930-я гады адбылося значнае змяншэнне колькасці яўрэяў у БССР, што тлумачыцца не толькі выездам іх за межы рэспублікі, але і рэпрэсіямі, а таксама асіміляцыйнымі працэсамі. І ўсё ж, нягледзячы на змяншэнне, БССР працягвала займаць трэцюю пазіцыю сярод саюзных рэспублік па гэтым паказчыку, хоць доля беларускіх яўрэяў зменшылася з 15,2% (1926 год) да 12,4% (1939 год) [11].

Аналізуючы вышэй прыведзеныя звесткі, бачна што колькасць яўрэйскага насельніцтва ў 1920-я гг. церпіць значныя змены. Гэта тлумачыцца шэрагам прычын. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. адным з першых дэкрэтаў Часовага ўрада быў дэкрэт аб ліквідацыі «мяжы аселасці». Наступныя затым падзеі першых паслярэвалюцыйных гадоў і эканамічная палітыка савецкай улады былі адзначаны сапраўднымі уцёкамі яўрэяў з заходніх рэгіёнаў у цэнтральную частку Расіі. Унутры былой "мяжы аселасці" таксама адбыўся значны рух яўрэйскага насельніцтва, які накіраваўся ў вялікія гарады. Акрамя традыцыйных шляхоў міграцыі (ЗША, Палестына, Аргенціна), паўсталі новыя, нетрадыцыйныя — краіны Прыбалтыкі (Літва, Латвія). Перасяленнем яўрэяў на іх гістарычную радзіму, у Палестыну, займалася ў першы паслярэвалюцыйны перыяд адна з шматлікіх сіяніцкіх арганізацый, якія ўзніклі на хвалі рэвалюцыйных пераўтварэнняў у Расіі,— «Гехалуц». Міграцыя яўрэйскага насельніцтва была і ўнутранай, і, галоўным чынам, тычылася стварэння яўрэйскіх сельскагаспадарчых камун. Звесткі аб узнікненні яўрэйскіх сельскагаспадарчых арцеляў на Віцебшчыне вельмі разрозненыя. Аднак сапраўдны росквіт габрэйскага сельскай хазяйства адбыўся пасля таго, як 29 жніўня 1924 г. спецыяльнай пастановай ЦВК СССР быў створаны Камітэт па зямельным уладкаванні яўрэйскіх працоўных, а ўслед за ім 17 студзеня 1925 г. Грамадства землеўпарадкавання яўрэйскіх працоўных. Сталі ўзнікаць новыя земляробчыя камуны, якія арганізоўвалі яўрэі гарадоў і мястэчак, як правіла, у сельскай мясцовасці побач са сваімі населенымі пунктамі. Толькі ў 1925 г. у Віцебскай акрузе паўсталі арцелі «Фрайндшафт» (Д. Бараўляны, Віцебскі раён), ім.Гірша Лекерта (в. Зачэрня, Лёзненскі раён), «Векер» (в. Грамашчэ, Полацкі раён), ім. Дуброўна), «Яўрэйскі араты» (в. Ляды, Дубровенскага раёна) і інш. закранула яўрэйскае насельніцтва Віцебшчыны і калгаснае будаўніцтва, якое ўжо на ўсю моц вялося да пачатку

1930-х гг. Для стварэння калгаса патрабавалася не менш за пяць сем’яў. Да 1930 г. у Віцебскай акрузе дзейнічала 9 яўрэйскіх калгасаў і 8 сельскагаспадарчых арцеляў з плошчай 1156 га [9].

Варта адзначыць, што адток яўрэйскага насельніцтва з Беларусі адбываўся ў першую чаргу за кошт жыхароў вёсак і мястэчак. З сярэдзіны 20-х гадоў, праўда, пачалася кампанія ўцягвання яўрэяў у сельскагаспадарчую працу, што павінна было ўтрымаць іх у сельскай мясцовасці [11]. Але ўжо на пачатку 1930-х гадоў дэмаграфічная сітуацыя яўрэйскага насельніцтва Віцебшчыны пачала мяняцца. У 1927-1929 гадах у СССР адбылася кампанія па ліквідацыі кулацкага класа. Многія сельскія жыхары, у тым ліку і яўрэі, былі прызнаныя "кулацкімі элементамі" і падвергліся рэпрэсіям. Варта адзначыць, што міграцыйныя працэсы яўрэйскай частцы насельніцтва згадваюцца ў крыніцах і гістарыяграфіі раней за 20-я гады ХХ стагоддзя. Так, напрыклад К. Карпекін у адным з сваіх артыкулаў вылучае прычыны па якіх яўрэйскае насельніцтва ў 1910-я гг.перамяшчалася з тэрыторыі Латвіі і Латгаліі ва ўсходнюю частку Віцебскай губерні. Галоўнай з іх з’яўлялася Першая Сусветная вайна, якая пацягнула за сабой бежанства і прымусовае высяленне яўрэяў расійскімі войскамі ў 1915 г. (бежанцамі з'яўляліся каля 85% мігрантаў)[12, с. 180].

Такім чынам, аналізуючы вышэй згаданыя дадзеныя колькасці яўрэйскага насельніцтва Віцебшчыны, відаць, што ў 1920-я гг.іх колькасьць значна змяншаецца. Гэта тлумачыцца шэрагам прычын. Адна з іх – Першая сусветная вайна, следствам якой сталі масавые ўцёкі і ваенныя страты. Таксама да адной з прычын можна аднесці ліквідацыю рысы габрэйскай аселасці. Вынікам гэтага служыць актывізацыя міграцыйных працэсаў. Таксама ў названы перыяд назіраецца высокая засяроджанасць яўрэйскага насельніцтва ў гарадах. Дэмаграфічная характарыстыка дае ўяўленне, што жаночая частка яўрэйскага насельніцтва пераўзыходзіць мужчынскую. Што датычыцца адукацыі, то тут цяжка падвесці вынік на тэрыторыі пазначанага рэгіёна. Аднак можна разгледзець гэтае пытанне на тэрыторыі ўсёй БССР з чаго відаць, што больш за палову яўрэйскага насельніцтва з'яўляюцца адукаванымі.

## ЛІТАРАТУРА

1. Воднева, І. П. Да пытанняаб яўрэйскіх пачатковых навучальных установах Полацка сярэдзіны XIX – пачатку XX стст. / І. П. Воднева // Полацкі музейны штогоднік: (зборнік навуковых артыкулаў за 2013 г.) / уклад. Т. У. Явіч. – Полацк: [НПГКМЗ], 2014. – 228 с.
2. Всесоюзная перепись населения 17 декабря 1926 г Вып. 5 : Возраст и грамотность. Европейская часть РСФСР. Белорусская ССР. – Центр. статист. упр. СССР. Отд. Переписи – М, 1928. – 10 т. – 61 с.
3. Всесоюзная перепись населения 17 декабря 1926 г. Вып. 4: Народность и родной язык населения СССР. – Центр. статист. упр. СССР. Отд. Переписи – М, 1928. – 10 т. – 138 с.
4. Всесоюзная перепись населения 1939 года: Основные итоги / Под ред. Ю.А.Полякова. – М.: Наука, 1992. – 256 с.
5. Зайцева, О. Н. Еврейская этническая общность Витебщины во второй половине XIX – начале XX вв.: особенности расселения и демографическая характеристика / О. Н. Зайцева // Труды молодых специалистов Полоцкого государственного университета имени Евфросинии Полоцкой. – Новополоцк: ПГУ, 2022.– с. 22-24.
6. Иоффе, Э. Г. Страницы истории евреев Беларуси. / Э. Г. Иоффе. – Минск: ПКФ «АРТИ-ФЕКС», 1996. – 292 с.
7. Карпекин, К. Бешенковичи - исторический очерк / К. Карпекин [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://mishpoha.org/arkhivarius/455-beshenkovichi-istoricheskij-ocherk . – Дата доступа: 25.04.2023.
8. Лепель: память о еврейском местечке / редкол.: С. Амосова [и др.]. – Москва, 2015. – 496 с.
9. Подлипский, А. К вопросу о миграционных процесах в еврейской среде Витебщины в межвоенный период (1920-1930-е гг.) / А. Подлипский [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://belisrael.info/?p=839 . – Дата доступа: 04.05.2023.
10. Постановление СНК СССР о дефектности Всесоюзной переписи населения 1937 г. 26 сентября 1937 г. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://docs.historyrussia.org/ru/nodes/47674-postanovlenie-snk-sssr-o-defektnosti-vsesoyuznoy-perepisi-naseleniya-1937-g-26-sentyabrya-1937-g#mode/ . – Дата доступа: 05.05.2023.
11. Розенблат Е. Динамика численности и расселения белорусских евреев в ХХ веке / Е. Розенблат, И. Еленская // “Диаспоры”. – 2002. - №4. – С. 27-52
12. Утраченное соседство: евреи в культурной памяти жителей Латгалии: Часть II / редкол.: С. Амосова [и др.]. – Москва, 2016. – 288 с.